Такім чынам, з дапамогай тэарэтычнага курса рэалізуецца задача па авалоданню правіламі функцыянавання тых ці іншых моўных форм, а ў практычным курсе — навыкамі і ўменнямі выкарыстання тых самых моўных з'яў у розных сферах маўленчай дзейнасці.

**Савіцкая Н.Я.**, *ст. выкладчык*

# МЕСЦА КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА АСПЕКТУ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ СТУДЭНТАМ ПЕРШАГА КУРСА ТЭХНІЧНАЙ ВНУ

У вышэйшай школе існуе пэўны разрыў паміж спецыяльнай і гуманітарнай адукацыяй. З-за недахопу ў вучэбных планах гуманітарных дысцыплін студэнты ВНУ дрэнна арыентуюцца ў развіцці сусветнай і нацыянальнай культуры, не ведаюць адметных асаблівасцей нацыянальнай культуры, не ў стане вызначыць яе месца ў кантэксце сусветнай культуры. Такая навука, як культуралогія, не выкладаецца ў тэхнічнай ВНУ, і, каб хоць нейкім чынам запоўніць гэтую вольную нішу ў адукацыі студэнта, выкладчыкам усяго комплексу дысцыплін пажадана было б увязваць матэрыял канкрэтнай дысцыпліны (якую можа разглядаць як адзін з аспектаў культуралагічнага цыкла) з гісторыяй яе ўзнікнення, развіцця, сучасным станам, вызначаць месца дысцыпліны ў шэрагу сумежных і яе ролю ў грамадстве, акцэнтуючы ўвагу на нацыянальны ўклад і змест і развіццё гэтай дысцыпліны, паказваючы яе станоўчыя і адмоўныя рысы і перспектывы развіцця.

Але звернемся да зместу самога паняцця «культуралогія» і вызначым яе мэты і задачы. Культуралогія —гэта навука аб



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры. Прадметам яе з'яўляюцца аб'ектыўныя заканамернасці грамадства і нацыянальных культурных працэсаў, помнікі, з'явы і падзеі матэрыяльнага і духоўнага жыцця людзей. Важнейшая задача культуролагаў — аналіз працэсаў і тэндэнцый сацыякультурнага асяроддзя сучаснасці.

Культуралогія павінна вырашыць наступныя задачы:

-- даць студэнтам неабходны мінімум тэарэтычных ведаў аб сутнасці, структуры, функцыях, заканамернасцях і асноўных гістарычных тыпах культуры;

-- дапамагчы гарманічнаму спалучэнню спецыяльных і гуманітарных ведаў, садзейнічаць выпрацоўцы прафесійнай этыкі;

-- выпрацаваць здольнасці да творчага, крытычна ўсвядомленага ўспрымання розных нацыянальна-культурных, этнаканфесійных і іншых платформ;

-- дапамагчы арыентавацца ў свеце культурных сімвалаў, напрамкаў у мастацтве, літаратуры, музыцы і г.д.

Такія задачы ставяцца перад студэнтамі, якім выкладаецца курс культуралогіі, і ў той жа час гэта патрабаванні да асобы, якая мае вышэйшую адукацыю. (Ва ўсякім выпадку, хацелася б яе такой бачыць. На сённяшні ж дзень сітуацыя такая, што людзі з вышэйшай адукацыяй і нават з навуковай ступенню, як правіла, з'яўляюцца добрымі спецыялістамі, але даволі абмежаваныя ў коле культуралагічных ведаў).

Сённяшняе жыццё патрабуе, каб малады чалавек, які скончыць ВНУ, быў адукаваным не толькі ў спецыяльнай галіне ведаў. Ён павінен ацэньваць дасягненні культуры на падставе ведання гістарычных умоў яе стварэння і развіцця, уяўленняў аб асноўных эпохах у гісторыі чалавецтва і іх храналагічнай паслядоўнасці; ён павінен выказаць і аргументаваць сваю ўласную пазіцыю і ацэнку гістарычнага мінулага, паказаць яго значэнне для сучаснасці. Знаёмства з сусветнай культурай

з'явіцца неад'емнай часткай інтэлектуальнага патэнцыялу тых, каму належыць у недалекім будучым прымаць рашэнні, якія будуць уплываць на сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны, уключаючы эканоміку, палітыку, культуру.

З'явы культуры вывучае мноства канкрэтных навук, кожная з якіх стварае пэўнае ўяўленне аб культуры як прадмеце свайго даследавання. Так, для археалогіі культура звязана з вывучэннем тых прадметаў, якія дайшлі да нас, у якіх матэрыялізаваны вынікі дзейнасці людзей мінулых эпох. У мове — душы народа — захоўваюцца, жывуць і развіваюцца ўсе скарбы і здабыткі духоўнай і, пэўным чынам, матэрыяльнай культуры этнасу і нацыі.

Мова — адзін з важнейшых сродкаў нацыянальнай культурнай адметнасці, а ва ўмовах нашай дзяржавы — найважнейшы, бо мы, беларусы, апынуліся у такой сітуацыі, якая можа прывесці да яшчэ большага звужэння функцый выкарыстання беларускай мовы, да яе заняпаду, а праз гэта — да размывання нацыянальнай адметнасці і паступовай асіміляцыі іншымі культурамі. Мова — найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі. У моўных сродках замацоўваецца каласальная праца ў пазнанні свету, адлюстраванне непаўторнага багацця свету праз выкарыстанне і спалучэнне пэўных гукаў, слоў і іншых адзінак і правіл іх спалучэння ў выказваннях. Мова з'яўляецца нойбольш каштоўным скарбам народа, яго відавочнай адзнакай; пачуццё адзінства мовы — адзін з асноўных кампанентаў нацыянальнай свядомасці. Менавіта праз родную мову адбываецца знаёмства кожнага чалавека са светам, праз матчыну мову чалавек становіцца членам першаснага калектыву, у якім ён жыве, праз родную мову ажыццяўляецца непарыўная сувязь чалавека са сваім народам. Разам з тым родная мова — гэта велізарны ўклад кожнага чалавека ў скарбніцу чалавечай культуры.

Спектр паняцця «культура» ў дачыненні да мовы надзвы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чай багаты і разнастайны: гэта план зместу і план выражэння, сістэмнасць і семіётыка, гісторыя мовы, яе функцыі і г.д.

У цяперашні час паняцце «культура» азначае гістарычна вызначаны ўзровень развіцця грамадства, творчых сіл і здольнасцей чалавека, выражаны ў тыпах і формах арганізацыі жыцця і дзейнасці людзей, а таксама ў стварэнні імі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Таму зразумець сутнасць культуры можна толькі праз прызму дзейнасці чалавека, народаў, якія насяляюць планету. Культура не існуе па-за чалавекам. Яна з самага пачатку звязана з чалавекам і народжана тым, што ён пастаянна імкнецца шукаць сэнс свайго жыцця і дзейнасці, удасканальваць сябе і свет, у якім жыве.

Грунтуючыся на вышэйсказаным, можна зрабіць выснову, што для таго, каб задаволіць патрабаванні асобы ў набыцці неабходных культуралагічных ведаў, неабходны заняткі беларускай мовай. Яны з'яўляюцца надзвычай важнай, глыбіннай і невычэрпнай крыніцай як чыста моўнага матэрыялу, так і здабыткаў усёй сусветнай культуры.

Беларуская мова, напрыклад у БДТУ, выкладаецца на першым курсе ўсіх факультэтаў, на яе адводзіцца 90 гадзін практычных заняткаў, а на двух факультэтах чытаюцца лекцыі і праводзяцца практычныя заняткі.

Праграма выкладання беларускай мовы прадугледжвае сістэмнае яе апісанне, каб даць цэласнае ўяўленне пра сучасную беларускую мову, у прыватнасці яе законы і нормы, паходжанне і асноўныя этапы развіцця, месца сярод іншых моў свету. Моўныя з'явы разглядаюцца як з пункту гледжання іх структурна-семантычных асаблівасцей, так і ў плане іх функцыянальных магчымасцей.

Ужо з першых заняткаў звяртаецца ўвага на адметнасць беларускай фанетыкі і арфаэпіі, выпрацоўваюцца нормы беларускага вымаўлення, праводзяцца паралелі з суседнімі мовамі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

замацоўваюцца навыкі правільнага вымаўлення з выкарыстаннем яркіх прыказак, прымавак, загадак, скорагаворак. Дарэчы варта адзначыць, што пераважная частка студэнтаў не валодае дасканалым літаратурным вымаўленнем, а беларуская фразеалогія — гэта амаль некранутая скарбонка моўных залацінак, выкарыстанне якой надзвычай узбагачае заняткі эмацыянальнасцю, вобразнасцю і заўсёды вельмі добра ўспрымаецца аўдыторыяй. Студэнты імкнуцца да ведаў, да добрага валодання мовай, зачароўваюцца самабытнасцю, дасціпнасцю беларускага слова, усведамляюць, што іх чакае вялікая і настойлівая праца ў глыбінным авалоданні мовай. І яны падрыхтаваныя да такой працы. Для многіх беларуская мова не з'яўляецца матчынай, але яны імкнуцца зрабіць яе сапраўды роднай, спасцігаючы моўныя здабыткі, створаныя шматлікімі пакаленнямі продкаў, сабраныя і даследаваныя, сістэматызаваныя і апрацаваныя таленавітымі навукоўцамі і літаратарамі, якія і сёння не здаюць мову на згубу.

Вывучэннне беларускай арфаграфіі носіць параўнальны характар, асабліва з рускай мовай, таму што падыходы ў гэтых мовах да правапісу розныя. Гэта выклікае белоруска-рускую і руска-беларускую інтэрферэнцыю. Тое ж датычыць і граматыкі. На адметнасць беларускай лексікі звяртаецца ўвага на працягу ўсяго перыяду навучання, і ў гэтым добра дапамагае слоўнік Ірыны Шкрабы «Самабытнае слова», у якім пададзена каля 900 безэквівалентных у рускамоўным дачыненні лексічных адзінак. (Напрыклад, абапал, абрасіцца, адвеку, анігадкі, апрытомнець, бабіць, бацькаўшчына, бруkaванка, браткі, брыль, бульбоўнік, бярозавік, ваўкалак, вечараваць, вырай, вятрыска, грамніца, дзірванець, Дзяды, дранікі, дужацца, екатаць, жорны, завіхацца, кнігарня, конаўка, краты, лагаднець, ластавяня, летаваць, спатоліцца, талака, угодкі, цягавіты, чытанка, шыба і інш.)

Прынцып лінейнасці (паслядоўнага і сістэмнага вывучэння фанетыкі, арфаграфіі, лексікі, граматыкі) спалучаецца з

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

камунікатыўным прынцыпам, які мае на мэце дабіцца ад студэнтаў практычнага валодання мовай, і гэтая мэта дасягаецца праз пісьмовы і вусны пераказ, дыялогі, дыскусіі, моўныя гульні, віктарыны, праз навучанне канспектаванню, праз складанне анатацый, рэцэнзій, напісанне рэфератаў на прапанаваныя найбольш актуальныя тэмы нашай сацыякультурнай сітуацыі.

Сацыякультурная сітуацыя — гэта сукупнасць тэндэнцый і контртэндэнцый, якія вызначаюць стан культуры дадзенага грамадства на пэўным этапе яго развіцця.

Для характарыстыкі сучаснай сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі неабходна прыняць да ўвагі шэраг фактараў, якія абумоўліваюць названую сітуацыю:

-- фактары ўнутранага развіцця, гэта, напрыклад, сацыяльная дынаміка, змены ў дзяржаўным ладзе, палітычным рэжыме і інш.;

-- гістарычныя фактары, у прыватнасці нацыянальныя фактары развіцця культуры, літаратуры, дзяржаўнасці, асаблівасці беларускага развіцця перыяду ВКЛ, уваходу ў Расійскую імперыю, асаблівасці культуры савецкага перыяду, у духу якога выхоўваліся і атрымлівалі адукацыю пакаленні беларусаў, якія жывуць і працуюць сёння;

-- уплыў на сучасныя беларускія культурныя працэсы агульнасусветнай, заходняй і расійскай сацыякультурных сітуацый.

Станоўчым момантам сучаснай сацыякультурнай сітуацыі ў Беларусі з'яўляецца дэідэалагізацыя ўсёй сістэмы адукацыі, што будзе садзейнічаць пад'ёму агульнага культурнага ўзроўню насельніцтва і павінна забяспечыць выпускнікоў ВНУ не толькі высокімі прафесійнымі навыкамі, але і агульнакультурнымі. Усё ж нельга не звярнуць увагі і на адмоўны бок гэтай сітуацыі — росквіт «масавай культуры», якая ператварае чалавека ў аб'ект, раздзяляе грамадства на эліту і масу, а маса нічога не можа

стварыць у культуры, выступае толькі спажыўцом «відовішч». Умела падабраныя тэксты з перыядычнага друку, аналіз сучаснай друкаванай прадукцыі, агляд навінак культуры дапамагае студэнтам вызначыць сапраўдныя каштоўнасці ў грамадстве, садзейнічае духоўнаму росту індывіда, развіццю яго «творчага свету», што заўсёды з'яўляецца крыніцай духоўнага і маральнага аптымізму. А мы ведаем, як гэта актуальна сёння, калі «псіхалагічны ўзровень народа» ніжэйшы, чым быў раней.

У Беларусі мяняецца мадэль грамадскага развіцця, аднак аб замене сацыяцэнтрызму (прыярытэт належыць не масе, а грамадству) антрапацэнтрызмам (у цэнтры светабудовы знаходзіцца чалавек) гаварыць яшчэ рана: гэта толькі адна з тэндэнцый развіцця беларускага грамадства.

Тут дарэчы будуць мастацкія біяграфіі славутых сыноў і дачок Беларусі, якіх яна шчодра нараджала і ўзгадоўвала на працягу сваёй драматычнай гісторыі (Рагнеда, Рагвалод, Е.Полацкая, К.Тураўскі, Л.Сапега, Т.Касцюшка, К.Каліноўскі і інш.), знакамітых дзеячаў культуры і адраджэнцаў (Ф.Скарына, Радзівілы, Агінскія, Луцкевічы і інш.), славутых навукоўцаў, якія праславілі Беларусь у свеце (К.Семяновіч, Наркевіч-Ёдка, І.Капіевіч, І.Гашкевіч, І.Дамейка, Б.Кіт і інш.), пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, спартсменаў і інш.

Збіранне беларускіх імёнаў, пошук праз іх свайго месца ў культурным свеце дазваляюць пазбавіцца манкуртызму, павышаюць узровень агульнай культуры і нацыянальнай свядомасці.

Адсутнасць еўрапейскага антрапацэнтрызму, моцны ўплыў расійскай і савецкай культуры маюць сваім вынікам адсутнасць беларускага нацыяналізму як складанай часткі самасвядомасці беларускага этнасу. Вучоныя адзначаюць і адсутнасць рускага нацыяналізму ў расіян, які падмяніўся палітыкай вялікадзяржаўнага шавінізму на дзяржаўным узроўні, а ў сучасных умовах пры адсутнасці духоўнай улады гэта прывяло

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да таго, што рускі нацыяналізм выбухнуў у выглядзе вялікай колькасці так званых «патрыятычных» і адкрыта фашысцкіх рухаў. У Расіі існуе звыш ста фашысцкіх друкаваных органаў, пра што вядома з гутаркі пісьменніка Г.Бакланава з Б.Ельцыным. І такога роду друкаваная прадукцыя трапляе да нас, згубна ўплываючы на моладзь, якая з асаблівай лёгкасцю ўспрымае ўсе новыя павевы.

Таму неабходна фарміраваць здаровы беларускі нацыяналізм, у старой тэрміналогіі — патрыятызм. Менавіта гэта ідэя хутчэй за іншыя можа з'яднаць усіх грамадзян, якія пражываюць у дзяржаве, незалежна ад іх нацыянальнасці, бо сёння мы не маем адной дзяржаўнай мовы, раз'яднаныя канфесійна, палітычна і г.д. Азнаямленне і з гэтымі пытаннямі мы можам правесці праз падрыхтоўку рэфератаў і іх прэзентацыю ў групах на такія тэмы, як «Рэлігіі ў Беларусі», «Нацыянальныя меншасці ў Беларусі» і інш.

Не застаюцца ў баку і глабальныя пытанні сучаснасці: праблемы народанасялення (падзенне нараджальнасці, «дэпапуляцыя», як кажуць дэмографы, у адных рэгіёнах і «дэмаграфічны выбух» у другіх), забруджванне навакольнага асяроддзя, абмяленне вадаёмаў, вычэрпванне традыцыйных крыніц энергіі, пагрозы голаду, захаванне чалавечага жыцця.

Такім чынам, заняткі па беларускай мове ўяўляюць сабой невычэрпную крыніцу культуралагічных аспектаў. На гэтых занятках у працэсе засваення зместу прадмета закранаюцца найважнейшыя пытанні нацыянальнай і сусветнай культуры, глабальныя пытанні выжывання чалавека ў створаных ім самім невыносных умовах, адбываецца нацыянальнае і агульнакультурнае развіццё асобы на падставе гуманістычных, высокамаральных і высокадухоўных пачаткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ